TV
31 канал

САМАЯ ПОЎНАЯ ТЭЛЕПРАГРАМА НА ТЫДЗЕНЬ: 31 КАНАЛ

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 СТУДЗЕНЯ 2012 г.
ПЯТНІЦА
№ 12
(27127)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

З 1 КРАСАВІКА АСОБНЫМ КАТЭГОРЫЯМ ГРАМАДЗЯН БУДЗЕ АКАЗВАЦЦА ДАДАТКОВАЯ САЦДАПАМОГА

Адпаведны ўказ нумар 41 «Аб дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамозе» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 19 студзеня, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Дакумент прыняты ў мэтах удасканалення сістэмы дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі і ўзмацнення дзяржаўнай падтрымкі насельніцтва.

У сістэму дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі ўключаецца забеспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця, якое прадастаўляецца сем'ям, маючым сярэднедушавы даход ніжэйшы за найбольшую велічыню бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага ўрадам, за два апошнія кварталы, а сем'ям пры нараджэнні двайнят або больш дзяцей — незалежна ад сярэднедушавога даходу.

Указам павялічваецца да 10-кратнага памеру бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва максімальны памер аднаразовай сацыяльнай дапамогі, а таксама пашыраюцца пералік тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі, якія падлягаюць аплаце за кошт сродкаў дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі, і кола асоб, якія маюць права на яе прадастаўленне.

Таксама ўводзіцца новы від сацыяльнай дапамогі для інвалідаў I групы і дзяцей-інвалідаў, якія маюць IV ступень страты здароўя.

Грамадзяне (сем'і) набываюць права на адначасовы зварот па прадастаўленне розных відаў дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі.

Указ уступае ў сілу з 1 красавіка 2012 года.

ДРУЖБА, ЯКОЙ МОЖНА ГАНАРЫЦЦА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Старшыню Кітайскай Народнай Рэспублікі Ху Цзіньтаа і кітайскі народ з 20-годдзем устанаўлення беларуска-кітайскіх дыпламатычных адносін.

«Умацаванне шматпланавых сувязяў з вялікім Кітаем з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў знешняй палітыкі беларускай дзяржавы, — падкрэсліў прэзідэнт. — На фундаменце традыцыйнай дружбы нашых народаў за мінулыя два дзесяцігоддзі мы выбудавалі цеснае стратэгічнае партнёрства».

У віншаванні гаворыцца, што ў Беларусі задаволены беспрэцэдэнтным ростам узаемнага гандлю, які за мінулыя гады павялічыўся ў дзясяткі разоў — з $34 млн у 1992 годзе да $3 млрд па выніках 2011 года. Нашы краіны прыступілі да практычнай рэалізацыі маштабных інвестыцыйных праектаў, уключаючы стварэнне сумесных прадпрыемстваў у Кітаі і Беларусі, запусцілі механізмы крэдытнага і міжбанкаўскага супрацоўніцтва.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларуска-кітайскае плённае ўзаемадзеянне ў галіне культуры, навукі, адукацыі пашыраецца з кожным годам, прыносячы значныя вынікі.

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што патэнцыял беларуска-кітайскага супрацоўніцтва далёка не вычарпаны. Вялікія перспектывы маюцца ў развіцці крэдытна-інвестыцыйных сувязяў і прамых кантактаў паміж рэгіёнамі і прадпрыемствамі дзвюх краін.

«Мы ганарымся тым, што ў нашых дзяржаў склаліся сапраўды брацкія адносіны, у якіх цудоўная будучыня, бо ў іх аснове ляжаць прынцыпы ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, павагі і раўнапраў. Спадзяюся, што дзякуючы далейшай актывізацыі сяброўскага дыялогу на вышэйшым і высокім узроўнях беларуска-кітайскія сувязі стануць узорам адносін паміж дзяржавамі ў XXI стагоддзі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Старшыня КНР Ху Цзіньтаа таксама павіншаваў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнку і беларускі народ з юбілеем дыпламатычных адносін.

У віншаванні гаворыцца, што на працягу 20 гадоў супрацоўніцтва паміж Кітаем і Беларуссю бесперапынна, стабільна і эфектыўна развіваецца. У 2005 годзе лідары дзяржаў аб'явілі, што адносіны дзвюх краін уступілі ў новы этап усебаковага развіцця і стратэгічнага партнёрства.

«Практыка сведчыць, што Кітай і Беларусь — сябры, якія давяраюць адзін аднаму, шчырыя і надзейныя партнёры. Двухбаковыя сувязі развіваюцца з улікам узаемных інтарэсаў абедзвюх краін і адыгрываюць важную ролю ў падтрыманні міру і стабільнасці ў рэгіёне і ва ўсім свеце», — заявіў Ху Цзіньтаа.

Старшыня КНР адзначыў: «У цяперашні час паміж Кітаем і Беларуссю — самы лепшы перыяд узаемадзеяння. 20-гадовы юбілей адкрывае новыя магчымасці і шырокія перспектывы. Я маю намер разам з вамі прыкладаць намаганні для павышэння ўзроўню двухбаковых сувязяў, усебаковага прасоўвання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва на карысць народаў дзвюх краін».

Кіраўнік Кітайскай Народнай Рэспублікі пажадаў Рэспублікі Беларусь працвітання і магутнасці, а яе народу — шчасця.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Як паведамляла «Звязда», днямі Прэзідэнт Беларусі даў інтэрв'ю вядучым кітайскім СМІ. З нагоды 20-годдзя беларуска-кітайскіх дыпламатычных адносін свае пытанні Аляксандру Лукашэнку змаглі задаць прадстаўнікі інфармацыйнага агенцтва «Сіньхуа», Цэнтральнага тэлебачання (CCTV), газеты «Жэньмінь жыбао», Міжнароднага радыё КНР. Сталі вядомыя падрабязнасці той гутаркі.

Фота БЕЛТА.

Кіраўнік беларускай дзяржавы лічыць, што неабходна рэагаваць на змяненні міжнароднай сітуацыі. «Таму мы сёння вывучаем пэўныя тэндэнцыі ў свеце. І, вядома ж, мы і прыстасоўвацца будзем, і мадэрнізаваць нашу палітычную сістэму. Правядзём парламенцкія выбары. І думаю, што нам трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу на палітычную рэформу, або рэформу палітычнай сістэмы нашай краіны, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы на гэта пойдзем, хоць у нас катастрофы ў гэтым плане няма. Але трэба заўсёды быць на крок наперадзе тых працэсаў, якія будуць у нас адбывацца. Я аб гэтым упершыню гавару, але абдумваў даўно гэта пытанне, абмяркоўваў гэтыя праблемы. І мы паціху будзем у гэтым напрамку рухацца».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Галоўнае — захаваць стабільнасць, даць магчымасць чалавеку нармальна жыць і выказваць сваё меркаванне. Галоўнае — чалавеку даць магчымасць захаваць яго асноўныя правы, на якія ён прэтэндуе і мае права іх мець».

Прэзідэнт Беларусі заявіў аб магчымай у бліжэйшы час сустрэчы з кітайскім кіраўніцтвам, падчас якой трэба будзе абмеркаваць шырокі спектр пытанняў.

Кіраўнік дзяржавы выказаў удзячнасць кітайскаму боку за эфектыўнае ўзаемадзеянне па ўсіх пытаннях. Прэзідэнт таксама сказаў, што Беларусь ганарыцца дружбай з такой магутнай і дынамічнай дзяржавай, як Кітай. Бакі абменьваюцца вопытам па многіх тэмах.

«Калі Кітайская Народная Рэспубліка нам у сім-тым падкажа, мы будзем вельмі ўдзячны. Ды і падкажа, таму што ў бліжэйшы час, я думаю, мы сустрэнемся і параімся з кітайскім кіраўніцтвам па многіх міжнародных праблемах», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным нарошчваць тэмпы беларуска-кітайскага супрацоўніцтва.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь і Кітай ведаюць, у якім напрамку далей рухацца. Разам з тым ён выказаў меркаванне, што «нам не хапае тэмпаў развіцця адносін».

Закрануўшы тэму Кітайска-беларускага індустрыяльнага парку, ён сказаў, што трэба таксама хутчэй рэалізоўваць гэты праект, не марудзіць.

Кітайскія журналісты цікавіліся, чаго не хапае ва ўзаемаадносінах Беларусі і Кітая. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ніякіх праблем не існуе. «У нас няма ніякіх праблем. Я не магу нават сказаць аб нейкіх праблемах, якія маглі б быць. І кітайскія людзі, і кіраўнікі, яны вельмі-вельмі спагадлівыя. Пачынаючы ад чарнобыльскай праблемы і заканчваючы крэдытнымі рэсурсамі — калі нам трэба, яны заўсёды ідуць насустрач, дапамагаюць, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Таму мне цяжка нават сказаць, што мы дзесьці ў чымсьці адстаём».

СТАР. 2

ЗІМА ПРЫЙШЛА. ЯЕ ЧАКАЛІ... ЯК ПРАЖЫЛІ, ЧЫМ СУСТРАКАЛІ?

Людзі сярэдняга і старэйшага веку, напэўна, чакалі нават з настальгіяй. Колісь зіма была сапраўднай зімой: са снегам, маразамі, завеямі. Калі снежнага покрыва намятала ў вёсцы на вулцы да ўзроўню плота, калі на вуліцу без цёплай шапкі і абутку і думаць нельга было выйсці...

Хто зараз радуецца снегу і марознаму паветру, дык гэта, напэўна, найперш дзеці: у кожным двары, дзе ёсць магчымасць, усе схілы пераўтвораны ў горкі, на санках, карыстаючыся момантам, не без задавальнення катаюцца і іх бацькі. Толькі калі адным гэта ў радасць, іншым — лішні цяжар і нагрузка. Дворнікам, напрыклад, якім трэба яшчэ ў цемры расчысціць тратуары і пасыпаць іх пяском. Аўтамабілістам, якім патрэбны дадатковы час, каб «адкапаць» з-пад снегу машыну і прагрэць яе рухавік, а потым яшчэ ўмудрыцца не трапіць у затор. Што ўжо казаць пра камунальныя службы, транспартнікаў? ДАІ традыцыйна снег «падвальвае» працы... Як пражылі гэтыя першыя зімовыя дні беларусы?

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Снег са сталічных вуліц пакуль не плавяць

За апошнія трое сутак з Мінска вывезена больш за 45 тыс. кубаметраў снегу. За гэтыя па-сапраўднаму зімовыя дні работы супрацоўнікам «Гаррэмааўтадара» значна прыбавілася: адсутнасць заторaў і ДТЗ на дарогах сталіцы ў такое надвор'е — у нейкай ступені на іх адказнасці.

— Сіноптыкі абяцаюць на некалькі наступных дзён снегапады. Для максімальнага забеспячэння эфектыўнага прыбірання горада ў такіх выпадках мы замаўляем дадатковую тэхніку, самазвалы для вывазу снегу ў іншых арганізацыях, — адзначыў Анатоль Жамоздзік , намеснік генеральнага дырэктара па бягучым утрыманні і рамонце прадпрыемства «Гаррэмаўтадар». Па яго словах, сёння на працы па прыборцы снегу задзейнічана 800 адзінак тэхнікі, 180-200 з якіх — менавіта самазвалы, якія вывозяць снег. Набыццё снегаплавільных машын, якія б дазволілі не стварацца за горадам снежным звалкі, пакуль знаходзіцца ў стадыі планаў. Каштуюць такія ўстаноўкі нямала, і, як адзначыў Анатоль Жамоздзік, пакуль на гэта няма сродкаў.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

ДАІ

Калі кіроўцы адчуваюць сябе няўпэўнена...

Хоць па-сапраўднаму кліматычная зіма назіраецца фактычна толькі крыху больш за два тыдні, за гэты час на дарогах краіны загінула больш за 40 чалавек, больш за 200 атрымалі раненні рознай ступені цяжкасці.

— Многія кіроўцы на зімовай дарозе пачуваюць сябе няўпэўнена. А калі крыху адаптуюцца да зімовай язды, забываюць пра непрадказальнасць дарогі. Гэта нярэдка прыводзіць да страты кантролю над аўтамабілем, — расказалі ва УДАІ МУС. — А менавіта ваджэнне аўтамабіля ў зімовы час дастаўляе нямала клопатаў, шматразова павялічвае верагоднасць дарожна-транспартных здарэнняў. Асабліва кіроўцаў, у якіх практычныя навыкі ваджэння яшчэ слабыя. Таму варта лішні раз нагадаць пра неабходнасць захавання павышанай бяспекі і выканання некаторых правілаў. Кіроўцам трэба выбіраць хуткасць руху з улікам стану праезнай часткі і бачнасці — часам бяспечная хуткасць не павінна перавышаць 50 кіламетраў у гадзіну. Нельга лічыць, як летам, што дастаткова хуткі і далёкі ад вас пешаход паспее перайсці дарогу да вашага прыбыцця. Ён можа паслізнуцца, упасці і ў выніку трапіць пад колы. Небяспеку ўяўляе нават чалавек, які стаіць на ўзбочыне, бо, зрабіўшы неасцярожны рух, таксама можа саслізнуць пад колы з таго валіка снегу, з якога збіраецца ступіць на праезную частку. Што датычыцца дзяцей, іх бяспечней за ўсё перавозіць у спецыяльных дзіцячых аўтакрэслах.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Руху цягнікоў снегапады — не перашкода

Чыгунка

Беларуская чыгунка мае неабходныя снегаўборачныя машыны і снегаачышчальнікі для ліквідацыі снежных заносаў на галоўных, станцыйных і пад'язных пуцях, паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе стальной магістралі. Аператыўная расчыстка стрэлачных пераводаў і пуцей ад снегу дазваляе арганізаваць бесперабойны рух усіх цягнікоў.

Расчыстка ад снегу чыгуначнага палатна і платформаў — адна з важнейшых задач па забеспячэнні бяспекі руху цягнікоў у зімовы перыяд. Спецыялісты Беларускай чыгункі пастаянна адсочваюць сітуацыю з умовамі надвор'я, каб у выпадку неабходнасці своечасова накіраваць снегаўборачную тэхніку ў раёны, дзе чакаюцца ападкі. Для эфектыўнага забеспячэння працы чыгункі ў зімовы час ва ўсіх аддзяленнях магістралі быў праведзены комплекс падрыхтоўчых мерапрыемстваў.

Моцны снегапад і вецер да 15—20 м/с

Прагноз

Сёння тэрыторыя Беларусі трапіць пад уплыў актыўных атмасферных франтоў, якія завіталі да нас з боку Балтыйскага мора, паведамілі рэдакцыі ў Рэспубліканскім гідраметцэнтры Мінпрыроды.

Таму чакаюцца складаныя ўмовы надвор'я. Часам будзе ісці снег, мяцеліца. Раніцай і ўдзень па большай частцы тэрыторыі снег моцны, на дарогах снежныя заносы. Вецер паўднёвы парывісты, на паўднёвым усходзе нават даволі моцны, да 15—20 м/с. У сувязі з гэтым сіноптыкі аб'явілі штармавое папярэджанне. Тэмпература паветра ад мінус 4 да плюс 1 градуса.

У суботу тэрыторыя краіны трапіць у зону паніжанага атмасфернага ціску. Уначы амаль паўсюдна, а ўдзень месцамі пройдзе кароткачасовы снег. На дарогах галалёдзіца. Уначы чакаецца мінус 1—8, пры праясненнях да 10—13 марозу, удзень — ад мінус 5 на паўночным усходзе да плюс 2 градусаў па паўднёвым захадзе краіны.

Моцны актыўны цыклон з цэнтрам над Балтыйскім морам пачне гаспадарыць у нас у нядзелю. Надвор'е ўвогуле сапсуецца. Чакаюцца сур'ёзныя снегапады, завірухі, моцны парывісты вецер, месцамі на дарогах снежныя заносы, па паўднёвым захадзе прагназуецца наліпанне мокрага снегу. Тэмпература паветра ўначы ад нуля па паўднёвым захадзе да мінус 8 градусаў на паўночным усходзе, удзень ад мінус 5 па поўначы да плюс 2 градусаў на паўднёвым захадзе краіны.

Сяргей КУРКАЧ.

Асаблівы рэжым не аб'яўлены

Брэстчына

Упершыню на Брэстчыну па-сапраўднаму завітала зіма ў мінулую суботу, калі з раніцы за кароткі час снежнае покрыва на некаторых участках дасягнула дзясятка сантыметраў.

Паводле інфармацыі абласнога ўпраўлення ЖКГ, камунальнікі вывелі на вуліцы 116 адзінак спецтэхнікі па вобласці. Праезную частку і тратуары сталі пасыпаць спецыяльнай сумессю, якой нарыхтавана больш за 1500 тон. Размяркоўвалі яе па раздзяляльным прынцыпе: тэхнічнай соллю ўперамешку з пяском апрацоўвалася праезная частка, а чыстым пяском пасыпалі тратуары і дваравыя тэрыторыі.

На пачатку і ў сярэдзіне тыдня снегапады ў рэгіёне былі непрацяглыя і кароткачасовыя. А вось у чацвер зноў пайшоў моцны снег. І служба жыллёва-камунальнай гаспадаркі задзейнічала частку тэхнічнага рэзерву: снегаўборачныя агрэгаты, экскаватары-пагрузчыкі і трактары з прычэпамі.

У сувязі з умовамі надвор'я адчуваецца напружанасць у рабоце Дзяржаўтаінспекцыі, хоць асаблівы рэжым работы гэтай службы ў рэгіёне пакуль не аб'яўлены. Так, за мінулыя выхадныя адбылося сем ДТЗ, у якіх адзін чалавек загінуў і 11 пацярпелі. Супрацоўнікі дарожнай міліцыі не стамляюцца заклікаць усіх удзельнікаў руху быць больш пільнымі, асцярожнымі, а кіроўцаў — не выязджаць без зімовых шын.

Яна СВЕТАВА.

СТАР. 2

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 220/С-7180, площадь – 272,7 кв.м, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – лесопильный цех с бытовыми помещениями, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 221585411601000009. Фундамент – бетонный, стены – газосиликатные блоки, кирпичные, перекрытия – деревянные, кровля – асбестоцементная. Имеется электричество. Стоимость 45 584 400 белорусских рублей.
Собственник (владелец) имущества	ЧПУП «Руман» (Глубокский р-н, д. Прозороки, ул. Полоцкая, 2В; УНП 391050800).
Местонахождение (адрес) имущества	Витебская обл., Глубокский р-н, Прозорокский с/с, д. Прозороки, ул. Полоцкая, д. 2В.
Место (адрес), дата и время проведения торгов	г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 322 17 февраля 2012 года в 14 часов 30 минут
Справочная информация	Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 322 http://vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Лесковец Денис Анатольевич, тел. 8 (0212) 49 13 46, +375(44) 744 63 00. Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670 не позднее 14 часов 00 минут 17.02.2012 года. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

БОЛЬШ ЗА ЎСЁ ШЛЮБАЎ ЛЕТАСЬ БЫЛО ЗАРЭГІСТРАВАНА Ў СТАЛІЦЫ

Пра гэта і не толькі на выніковай калегіі Міністэрства юстыцыі паведаміў міністр Алег СЛІЖЭЎСКІ.

У 2011 годзе органамі ЗАГС зарэгістравана больш як 352 тысячы шлюбаў. Гэта на 3% больш, чым у 2010-м. Больш за 64 тысячы з іх зарэгістравана ў Мінску, на другім месцы — каля 55 тысяч — Гомельская вобласць. Амаль 45% усіх шлюбаў рэгіструецца ва ўрачыстай абстаноўцы.

— Традыцыйным стала правядзенне цырымоній заключэння шлюбаў па індывідуальных сцэнарах, якія распрацоўваюцца з улікам пажаданняў грамадзян, — адзначыў Алег Сліжэўскі. — Пры гэтым урачыстасці праходзяць не толькі ў памяшканнях загсаў, але і ў гістарычных месцах, установах культуры, мастацтва. Найбольшай папулярнасцю карыстаюцца канцэртная зала «Верхні горад», дзіцячая філармонія ў Мінску, Нацыянальны мастацкі музей, Мірскі замак, культурна-спартыўны комплекс «Мінск-Арэна» і інш.

Не менш актыўна арганізоўваюцца і юбілейныя ўрачыстасці. Так, летась праведзена ажно 960 «залатых» і больш за 760 «сярэбраных» вяселляў.

Паводле слоў Алега Сліжэўскага, у цэлым работа Мінюста арыентавана на стварэнне ўмоў для атрымання грамадзянамі якасных і даступных прававых паслуг.

СТАР. 2

ПЛАТА ЗА НАВУЧАННЕ ЎЗРАСЦЕ З 1 ЛЮТАГА?

Памер павышэння платы за навучанне ў беларускіх ВНУ плануецца вызначыць да 25 студзеня.

Па словах прэс-сакратара міністра адукацыі Юліі Ванінай, у пачатку гэтага года ў ВНУ праводзіўся маніторынг прагнозу кошту платнага навучання. Спецыялісты міністэрства правялі ў падведамасных установах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі дзяржаўнай формы ўласнасці даследаванне ўзроўню цэн на платнае навучанне. Маніторынг дазволіў вывучыць абгрунтаванасць павелічэння выдаткаў на навучанне ў разрэзе ВНУ і спецыяльнасцяў. Мяркуецца, што павышэнне аплаты будзе здзейснена з 1 лютага, а ў студзені ВНУ возьмуць са студэнтаў плату за навучанне па ранейшых «расцэнках».

У Міністэрстве адукацыі дадалі, што кошт платнага навучання зменіцца з улікам прынятых урадам рашэнняў: па павелічэнні з 1 студзеня 2012 года тарыфнай стаўкі першага разраду, па ўдасканаленні аплаты працы педагагічных работнікаў з кола прафесарска-выкладчыцкага саставу, якія не маюць вучонай ступені ці вучонага звання, а таксама ў сувязі з павышэннем іншых цэн і тарыфаў на работы, у тым ліку на камунальныя паслугі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 20.01.2012 г. (для б/н разлікаў)

▼1 долар ЗША	8 360,00	1 чэшская крона	420,67
▲1 еўра	10 750,00	1 польскі злоты	2 470,89
1 латвійскі лат	15 350,72	▲1 расійскі рубель	266,00
1 літоўскі літ	3 112,84	1 украінская грыўня	1 039,22

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	31,4777
10 UAH	39,1173
10000 BYR	37,6078
EUR	40,4772

ДРУЖБА, ЯКОЙ МОЖНА ГАНАРЫЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Вось патрэбна нам была кансультацыя — лепшыя спецыялісты па фінансавых праблемах прыехалі. Гэта значыць, Кітай адклікаецца на ўсе нашы просьбы ў той жа час, як і мы. З задавальненнем едуць кітайцы да нас вучыцца, і спецыялістаў мы рыхтуем добрых. Гэта значыць, у нас няма ніякіх праблем. Адзін званок, сігнал — і мы рэагуем гэтак жа, як і Кітай рэагуе. Але цяпер трэба хутчэй, значна хутчэй рабіць гэта ўсё», — сказаў Прэзідэнт.

Беларусь не супраць перадаць Кітаю будаўніцтва «Мінск-Сіці».

«Мы пачалі будаўніцтва «Мінск-Сіці», заявілі аб гэтым будаўніцтве. Мы вельмі былі б зацікаўлены, каб «Мінск-Сіці», вось так, як у Пекіне вы пабудавалі (гэта будзе, вядома, не такая вялікая будоўля), каб кітайцы прыехалі і дапамаглі нам пабудаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён прадоўжыў: «Няхай Кітай будуе і фінансуе, і прадае потым гэтыя плошчы, мы не супраць перадаць вам гэтую будоўлю, сумесна з іншымі кампаніямі — дзяржаўнымі, прыватнымі і гэтак далей».

Аляксандр Лукашэнка лічыць увядзенне адзінай валюты ў АЭП пытаннем доўгатэрміновай перспектывы.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што тэма перспектыў валютнага рэгулявання не абмяркоўвалася на вышэйшым узроўні. «Мы яшчэ гэтыя пытанні не абмяркоўвалі. Мы не выключаем, што можа быць адзіная валюта. Але гэта павінна быць новая валюта, як у Еўрапейскім саюзе, нейкае «еўра», але ні тэнге, ні беларускі рубель, ні расійскі, а штосьці ў плане адзінай валюты. У першым набліжэнні, калі мы абмяркоўвалі гэта пытанне, мы аб гэтым гаварылі. І расіяне, і казахі, і мы сыходзімся на тым, што гэта нармальна», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Але гэта апошняя стадыя нашых перагавораў і нашага руху да больш цеснага Еўразійскага саюза. Мы яшчэ пакуль да гэтага не дайшлі, для гэтага гады спатрэбяцца».

АЭП адкрывае новыя магчымасці для пашырэння гандлю паміж Беларуссю і Кітаем.

«Гэта сапраўды новыя магчымасці для пашырэння тавараабароту паміж Кітайскай Народнай Рэспублікай і ў цэлым з Адзінай эканамічнай прасторай, у якую ўваходзяць тры дзяржавы — Казахстан, Беларусь і Расія», — сказаў Прэзідэнт.

Адказваючы на пытанне, ці не стане на нейкім этапе Кітай канкурэнтам для АЭП, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Так, вядома ж, канкурэнцыя ёсць, яна была і будзе. Кітай вельмі рухомы ў гэтым плане, вельмі агрэсіўны ў пашырэнні сваіх тавараў. Таму, зразумела, будзе канкурэнцыя, але разумныя людзі знойдуць кампраміс. Што датычыцца беларусаў, вы можаце на нас разлічваць у рабоце ў Адзінай эканамічнай прасторы. Таму Кітаю ніяк не трэба баяцца Адзінай эканамічнай прасторы».

Прэзідэнт падкрэсліў, што Кітай даўно актыўна і паспяхова гандлюе з усімі краінамі АЭП — Беларуссю, Расіяй, Казахстанам. «Цяпер тут адзіныя правілы: калі вы прыходзіце ў Беларусь — лічыце, што вы прыйшлі ў Казахстан, лічыце, што вы прыйшлі ў Расію. Калі «Мідэа-Гарызонт» сёння вырабляе ЗВЧ-печы, пыласосы, вы свабодна можаце прадаваць тавары сумеснага прадпрыемства на гэтым вось рынку са 170-мільённым насельніцтвам. Гэта вялікі рынак, вельмі ёмісты», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Адказваючы на пытанне аб планах далейшага развіцця Беларусі, Прэзідэнт адзначыў, што для нас важны эканамічны рост: «Што датычыцца эканомікі, то мы не можам паскардзіцца на тэмпы росту. Вядома, спад усё ж такі быў, але мы ўтрымаліся разам з Кітайскай Народнай Рэспублікай у гэтым плане. Таму мы дакладна вызначылі — для нас вельмі важны гэты рост. Беларуская эканоміка падобная на кітайскую ў тым плане, што і ў вас, і ў нас не хапае ўласных энерганосьбітаў. Калі б у Кітаі былі свае энерганосьбіты, як у Расіі, дапусцім, то ўжо Кітай дыктаваў бы свае ўмовы ўсяму свету, эканамічныя ўмовы, і быў бы супердзяржавай яшчэ большай, чым Амерыка. Але вам даводзіцца закупляць усё. Але ў адрозненне ад нас, закупляючы шмат па імпарце, вы вельмі шмат экспартуеце, і ў вас дадатны гандлёвы баланс».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў 2011 годзе Беларусь выйшла на дадатны баланс, у гэтым годзе такі ж працэс назіраецца. Аляксандр Лукашэнка выказаў словы ўдзячнасці за тое, што кітайскія банкаўскія спецыялісты ў цяжкі для нашай краіны перыяд вельмі дапамаглі са сваімі рэкамендацыямі.

Візіт старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў У Банга ў Беларусь у 2011 годзе садзейнічаў значнай актывізацыі двухбаковага супрацоўніцтва.

На думку кіраўніка дзяржавы, гэта быў знакавы візіт. У час перагавораў з У Банга было абмеркавана шмат важных тэм беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў Кітаю больш актыўна развіваць сувязі з Беларуссю.

Прэзідэнт адзначыў важнасць дасягнутай дамоўленасці аб будаўніцтве ў Беларусі Кітайска-беларускага індустрыяльнага парку. Кітай мадэрнізуе беларускія энергетычныя аб'екты, ЦЭЦ, гатовы фінансаваць будаўніцтва гідраэлектрастанцый, канстатаваў Прэзідэнт.

«Кітай гатовы будаваць тут прадпрыемствы. Вось і апошняя дамоўленасць — аб выпуску ў нас легкавых аўтамабіляў. Кітай мае магчымасць тут гандляваць не толькі ў Адзінай эканамічнай прасторы, але і ва ўсёй Еўропе. Наогул з Кітая везці — калі ласка, мы вам прадстаўляем тут умовы не горшыя, чым у Кітаі для вашых вытворцаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Размова ідзе таксама аб будаўніцтве ў Беларусі гандлёва-лагістычных, транспартна-лагістычных цэнтраў, мадэрнізацыі Нацыянальнага аэрапорта, узвядзенні жылля з удзелам кітайскіх крэдытаў і кітайскіх спецыялістаў. Беларусь і Кітай ствараюць сумесныя прадпрыемствы па вытворчасці трактароў, гатовыя адкрыць прадпрыемствы па выпуску аўтобусаў, аўтамабіляў.

Прэзідэнт адзначыў, што стала больш актыўна працаваць сумеснае прадпрыемства «Мідэа-Гарызонт» па выпуску бытавой тэхнікі.

«Ідзе ўзаемны працэс: мы там ствараем прадпрыемствы, а Кітайская Народная Рэспубліка тут. І ў нас няма закрытых тэм — пачынаючы ад продажу ў вас калійных угнаенняў і да стварэння касмічнага спадарожніка для Кітая. Спектр вялікі. Па ўсіх напрамках мы ўжо ведаем, як рабіць і што рабіць. Мы ні з адной краінай так хутка не рухаемся наперад у нашых адносінах, як з Кітайскай Народнай Рэспублікай», — адзначыў Прэзідэнт.

Калісьці, у 2000 годзе, Беларусь і Кітай імкнуліся да тавараабароту $500 млн. А ў мінулым годзе беларуска-кітайскі тавараабарот дасягнуў $3 млрд. «Гэта вялікая перамога, асабліва для нас, таму што кітайскі рынак забіты прапанаваннямі, вельмі цяжка туды трапіць. Вядучыя кампаніі свету супрацоўнічаюць з кітайцамі і будуюць свае прадпрыемствы. Але дзякуючы таму, што ў нас стратэгічны ўзровень супрацоўніцтва, нам удаецца замацавацца на вашым рынку і там працаваць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы, адказваючы на пытанні кітайскіх журналістаў.

Ён яшчэ раз падкрэсліў, што пасля візіту У Банга пачаўся больш інтэнсіўны працэс супрацоўніцтва па ўсіх напрамках — крэдытнага фінансавання, прыходу на беларускі рынак многіх кітайскіх кампаній.

Прэзідэнт асабліва адзначыў, што стала больш актыўна працаваць беларуска-кітайская міжурадавая камісія па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. Гэту камісію з беларускага боку ўзначальвае былы пасол Беларусі ў Кітаі, а цяпер віцэ-прэм'ер Анатоль Тозік, якога ў Кітаі вельмі паважаюць, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі лічыць магчымым прадухіленне другой хвалі сусветнага крызісу, калі будзе жаданне ва ўсіх сусветных ігракоў змагацца з ім.

«Калі ж і Кітайская Народная Рэспубліка, і СМІ Кітая пачалі аб гэтым гаварыць, то гэта сур'ёзна. Магчыма, менш небяспечна для Кітая, хоць таксама небяспечна — эканоміка разагрэта, тэмпы шалёныя, насельніцтва вялікае, людзей карміць трэба. Гэта, зразумела, вельмі важна і небяспечна для любой дзяржавы, а тым больш для такой гіганцкай, з такой інерцыяй, як Кітайская Народная Рэспубліка. Для ўсіх гэта небяспечна», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«І паглядзіце, што адбываецца нават у Амерыцы. Вось яны неяк дыстанцыруюцца ад Еўропы. Відаць, перадвыбарная кампанія пачалася, і яны неяк прыхарошваюць рэчаіснасць, але ж мы бачым — «Захапілі Уол-стрыт» і іншае, дэманстрацыі, маніфестацыі, абвал нядаўні. Крызіс і абвал пачаўся з Амерыкі, там гэтыя працэсы яшчэ тлеюць, яны не ліквідаваны. Паглядзіце, які дзяржаўны доўг ЗША. Гэта ж інфляцыя долара па ўсім свеце. І вельмі не выгадна, перш за ўсё, Кітаю, таму што ў вас і каштоўных папер амерыканскіх куплена нямала, і ў вас залатавалютныя рэзервы вышэйшыя за трыльён. У вас долараў гэтых мора і вам хацелася б, зразумела, каб долар быў стабільным. І ў той жа час вы можаце абваліць гэты долар, але, напэўна, гэта не патрэбна, бо вы маглі гэта зрабіць у мінулы крызіс, але, малайцы, захавалі планету ад развалу», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што відавочныя праяўленні крызісу: «І ўжо кіраўнік МВФ гаворыць аб тым, што гэта будзе крызіс, і што гэта можа скончыцца больш страшнай дыпрэсіяй, чым у трыццатыя гады мінулага стагоддзя. Гэта значыць сімптомы гэтага крызісу відавочныя — і спад вытворчасці ў вядучых эканоміках свету».

Разам з тым Прэзідэнт выказаў меркаванне, што крызіс можна прадухіліць. «На цяперашнім этапе з крызісам справіцца можна, калі будзе жаданне ва ўсіх сусветных ігракоў змагацца з гэтым крызісам. Мы не прайшлі пункт незвароту, мы яшчэ не ўлезлі ў гэтыя крызісныя з'явы па вушы. Таму сёння трэба крызіс прадухіліць. І Кітайская Народная Рэспубліка тут павінна сыграць разам з амерыканцамі вядучую ролю», — падкрэсліў беларускі лідар.

Адказваючы на пытанне адносна таго, як зменіцца, на думку Прэзідэнта, абстаноўка сусветнай бяспекі ў гэтым годзе, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Хацелася б, каб былі зменены да лепшага. Але ёсць вельмі негатыўны зачын з мінулага года, які мы назіраем у гэтым годзе. Вельмі нестабільна на арабскай дузе. Вы бачыце, што адбываецца з Сірыяй (там відавочны і замежныя ўмяшанні). Калі б не Кітай і Расія, то Сірыю ўжо, напэўна, даўно раздавілі б».

Пры гэтым ён падкрэсліў: «Ні Кітаю, ні Расіі, ні іншым краінам, якія хочуць жыць у міры і дружбе, гэта дэстабілізацыя не патрэбна. Вы бачыце, што адбываецца ў краінах арабскага ўсходу, дзе перамаглі так званыя дэмакратычныя рэвалюцыі. Там лепш не стала. Да ўлады прыходзяць не тыя сілы, на якія нехта разлічваў. Але трэба было гэтага чакаць. Тое ж самае можа і з Сірыяй адбыцца. Паглядзіце, што адбываецца вакол Ірана... Але калі рване там, дзе 40 працэнтаў сусветнай нафты здабываюць, гэта будзе вельмі цяжка для ўсёй планеты, эканамічны крызіс тады непазбежны. І ён прывядзе да моцных сацыяльных узрушэнняў. Магчымы і канфлікты ў іншых частках планеты. Нават у Еўрасаюзе, у Еўропе, паглядзіце, як абвастрыліся адносіны. Гэта значыць тыя тэндэнцыі, якія былі скрытыя, нябачныя, цяпер яны пачалі праяўляцца».

Прэзідэнт адзначыў, што ў Беларусі шмат цікавых для замежных турыстаў аб'ектаў. «Мы хацелі б больш бачыць тут кітайцаў. Багатых людзей у вас, напэўна, ужо больш, чым у Амерыцы, няхай не мільярдэраў, як у іх, але даволі багатых людзей, якія могуць сабе дазволіць прыехаць, паглядзець, адпачыць у Беларусі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён лічыць, што народы дзвюх краін павінны больш знаёміцца з культурай і традыцыямі адзін аднаго. У Беларусі гатовы садзейнічаць таму, каб прадстаўнікі Кітая вывучалі беларускую гісторыю, культуру, прыроду. «Мы павінны прадстаўляць сваю культуру, арганізоўваць Дні культуры. Наша мастацтва, наш балет, оперу трэба туды везці паказваць, трэба і эстраду, хоць Кітай істотна рушыў наперад у гэтым напрамку», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Мы гатовы зрабіць усё для таго, каб кітайскі народ больш даведаўся аб Беларусі. Ведаеце, я задумваюся над гэтым пытаннем, калі прылятаю ў Кітай. Думаю: гэта амаль паўтара мільярда чалавек, а як зрабіць, каб больш людзей даведаліся аб нашай краіне? Так, палітыкі ведаюць, бізнэсмены, якія ў чымсьці зацікаўлены, але ў Кітаі столькі іншых напрамкаў, магутных напрамкаў...».

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што для актывізацыі кантактаў трэба адкрываць прамыя авіярэйсы.

Разам з тым Прэзідэнт заўважыў, што ўсё ж такі галоўнае ў супрацоўніцтве — эканоміка. Паколькі калі будуць вельмі шырокія эканамічныя адносіны, значыць, у геаметрычнай прагрэсіі будзе павялічвацца цікавасць кітайскіх людзей да Беларусі. Культура — не аснова адносін, гэта ўжо вынік эканамічных і гандлёвых адносін.

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка сказаў аб значнасці развіцця спартыўных сувязяў з Кітаем. На яго думку, спорт — гэта вялікая дыпламатыя.

У сувязі з надыходзячым новым годам па кітайскім календары, які з'яўляецца годам дракона, журналісты спыталі, што Прэзідэнт пажадаў бы кітайскаму народу. Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Не дарэмна, напэўна, дракон стаў сімвалам Кітая. У вас ёсць усё, што сімвалізуе дракон. І мудрасці, і шчасця, і грошай у вас сёння хапае, і нармальна краіна развіваецца. Я вам жадаю цішыні і стабільнасці, каб у вас было ціха, спакойна, ніякіх канфліктаў, ніякіх войнаў. Вось такое спакойнае развіццё прывядзе нашых сяброў, Кітайскую Народную Рэспубліку, на першыя пазіцыі ў свеце».

Паводле паведамлення прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Абзац

◢ Работы па рэканструкцыі ўніверсама «Сталічны» ў Мінску будуць завершаны сёлета ў 3-м квартале, мяркуюць у Галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.

◢ **На 56-м км трасы Мінск — Гродна 18 студзеня каля 20.00 фура «Мерседэс-Бэнц», за рулём якой быў 43-гадовы грамадзянін Украіны, страціла кіраванне, выехала на сустрэчную паласу і сутыкнулася з аўтамабілем «Сеат». У легкавым аўтамабілі ехаў мужчына з 4-гадовым сынам. У выніку аварыі мужчына атрымаў закрыты пералом грудзіны і быў дастаўлены ў бальніцу. Дзіця з закрытай чэрапна-мазгавой траўмай цяжкай ступені, пераломам зводу чэрапа трапіла ў рэанімацыю ў вельмі цяжкім стане.**

◢ Два чалавекі загінулі ў ноч на 19 студзеня на пажары ў жылым доме ў Драгічыне. Пра пажар на вул. Кастрычніцкай паведаміў сведка. Праз чатыры хвіліны на месца прыбылі ратавальнікі. На той час дом палаў і агонь выходзіў на дах. Падчас тушэння пажару знойдзены целы мужа і жонкі — пенсіянераў. Прычына пажару высвятляецца.

◢ **Незвычайнае ДТЗ з удзелам двух аўтамабіляў для спаборніцтваў здарылася ў Мінскім раёне. Каля вёскі Кіршы сутыкнуліся два Subaru Impreza. Пасля гэтага адбылося ўзгаранне, пацярпелі тры чалавекі — абодва кіроўцы і пасажыр. Іх даставілі ў бальніцу.**

◢ У Магілёве па тэлефоне 102 пазваніла невядомая і паведаміла, што ў пад'ездзе дома па вул. Першамайскай закладзена выбуховае прыстасаванне. У ходзе праверкі інфармацыя не пацвердзілася. Побач з домам была затрыманая 32-гадовая мясцовая жыхарка, раней судзімая за крадзеж і падпал. Як высветлілася, тэлефанавала менавіта яна. Такім чынам жанчына хацела «насаліць» маці свайго маладога чалавека, якая жыве ў гэтым доме: тая забараніла сыну сустракацца з «мінёркай». Заведзена справа.

Поўны абзац

◢ **20-гадовая прадавачка самастойна затрымала злодзея — дагнала і звяліла з ног. Выпадак здарыўся 17 студзеня. Касір адной з мінскіх крам звярнула ўвагу на двух п'янаватых хлопцаў, якія знаходзіліся ў гандлёвай зале. Іх паводзіны здаліся дзяўчыне падазронымі, бо хлопцы стаялі вельмі блізка адзін да аднаго і закрывалі агляд. Затым адзін з іх прайшоў праз пункт разліку і паведаміў, што ў яго пакеце нічога няма, а яго таварыш стаў у чаргу. Калі малады чалавек праходзіў міма, дзяўчына заўважыла, што ён схаваў пад курткай пляшку гарэлкі. Яна паклікала кліента, але малады чалавек адказаў, што нічога не браў, і кінуўся да выхаду. Прадаўніца крамы кінулася следам, дагнала злодзея, паваліла яго на зямлю і запатрабавала вярнуць скрадзенае. Зразумеўшы, што ўцячы не атрымаецца, хлопец аддаў тавар і разам з касірам дачакаўся прыбыцця міліцыі. Як высветлілася, затрыманы — 22-гадовы шліфоўшчык аднаго з прадпрыемстваў.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

А Ў НАС У САЛОНЕ — ГАЗ...

Не было яшчэ 9 гадзін раніцы, калі ў сталіцы па лініі «102» паступіла інфармацыя: у салоне аўтобуса гарадскога маршрута №101 невядомыя распылілі газ. Забягаючы наперад, адразу заўважым, што ніхто з пасажыраў не пацярпеў.

Як паведамілі ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама, калі на месца здарэння прыбыў нарад аддзела дэпартамента аховы Фрунзенскага раёна, які быў да яго бліжэй за іншых, кампаніі з трох маладых людзей, адзін з якіх і распыліў газ з балончыка, у транспарце ўжо не было. Сваю справу дзяцюк паспеў зрабіць на задняй пляцоўцы, калі аўтобус ехаў па вуліцы Адоеўскага. Прыкметы маладзёнаў апісалі пасажыры, і па іх супрацоўнікі міліцыі затрымалі кампанію ўжо каля аднаго з дамоў на той жа вуліцы. Гэта аказаліся раней судзімыя браты (1992 і 1988 гадоў нараджэння) і іх 21-гадовы (таксама раней судзімы) знаёмы. Апошні і распыліў у аўтобусе газ з балончыка, які набыў на рынку ў Ждановічах. Навошта гэта зрабіў, патлумачыць той не змог, толькі спасылаўся на стан алкагольнага ап'янення. Зараз супрацоўнікі Фрунзенскага РУУС праводзяць праверку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЯК СМЕЦЦЕ, У КАНТЭЙНЕР...

У Пінску ў смеццевым кантэйнеры знайшлі цела нованароджанай дзяўчынкі.

Немаўлятка было задушана. У здзяйсненні злачынства падазраецца маці маленькай ахвяры, 18-гадовая пінчанка. Дзяўчына трапіла ў бальніцу з паслярадавай траўмай. Яна — студэнтка сельскагаспадарчай ВНУ, зараз у акадэмічным адпачынку. Калі віна маладой асобы будзе даказана, ёй пагражае немалы тэрмін зняволення.

Яна СВЕТАВА.

БОЛЬШ ЗА ЎСЁ ШЛЮБАЎ ЛЕТАСЬ БЫЛО ЗАРЭГІСТРАВАНА Ў СТАЛІЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Так, у мінулым годзе натарыусы больш як 2,5 тысячы разоў выехалі ў сельскія населеныя пункты, дзе прынялі больш за 23 тысячы грамадзян. Укараненне новай формы арганізацыі работы ў аграгарадках — натарыяльнага абслугоўвання сельскіх жыхароў на даму — вызваліла грамадзян ад часавых і фінансавых выдаткаў на паездку ў раённы цэнтр.

Больш за 65 натарыяльных дзеянняў было здзейснена ў адпаведнасці з прынцыпам аднаго акна.

Эфектыўнай назваў міністр юстыцыі і працу беларускіх адвакатаў. Пры гэтым падкрэсліў, што сёння юрыдычная дапамога даступная для самых розных катэгорый грамадзян. Так, летась адвакаты выканалі 800 даручэнняў жыхароў аграгарадкоў.

Штогод жа адвакаты выконваюць каля 350 тыс. даручэнняў. Істотная іх частка, каля 30%, аказваецца адвакатамі бясплатна.

Акрамя таго, з 1 верасня мінулага года ў нашай краіне пачаў працаваць вэб-партал адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных і індывідуальных прадпрымальнікаў. З яго дапамогай на тэрыторыі Мінска ажыццяўляецца электронная рэгістрацыя суб'ектаў гаспадарання, узгадненне найменняў у электронным выглядзе, а таксама перадача электронных апавяшчэнняў аб змяненні месцазнаходжання юрыдычных асоб. Дзякуючы інфармацыйным сістэмам, якія эксплуатуюцца Міністэрствам юстыцыі, істотна спрасцілася і працэдура атрымання даведак пры ліквідацыі бізнэсу.

— Значна расшырылася работа і па разглядзе дакументаў у межах міждзяржаўных утварэнняў, — сказаў міністр. — Новым кірункам для міністэрства летась стала работа па кадыфікацыі дагаворна-прававой базы Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы. Падрыхтаваныя Мінюстам падыходы па кадыфікацыі былі ўхвалены бакамі і прыняты за аснову.

Як вядома, Міністэрства юстыцыі займаецца таксама і рэгістрацыяй грамадскіх аб'яднанняў, фондаў. Алег Сліжэўскі назваў журналістам прычыны адмовы ў рэгістрацыі партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя. «У пададзеных для рэгістрацыі дакументах БХД быў знойдзены шэраг парушэнняў. У цэлым яны былі аформлены неналежным чынам. Таму ў адпаведнасці сувязі з заканадаўствам Мінюст быў вымушаны прыняць рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі БХД».

Надзея ДРЫЛА.

Крымінальная справа заведзена ў дачыненні да групы праваахоўнікаў у Магілёўскай вобласці

Крымінальная справа заведзена ў дачыненні да групы супрацоўнікаў праваахоўных органаў з Магілёўскай вобласці, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў аддзеле інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Следчага камітэта Беларусі.

Як патлумачылі ў ведамстве, Галоўным упраўленнем па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС і Следчым камітэтам была спынена злачынная дзейнасць службовых асоб органаў унутраных спраў і папярэдняга расследавання Клімавіцкага раёна, якія вымагалі ў прадпрымальніка $500 тыс. Шляхам шантажу і пагроз у снежні 2011 года і студзені 2012 года яны атрымалі каля 8 млн расійскіх рублёў за непрыцягненне гэтага чалавека да крымінальнай адказнасці.

Аднак 18 студзеня пры атрыманні чарговай часткі грошай (500 тыс. расійскіх рублёў) яны былі затрыманы. Сярод затрыманых старшы оперупаўнаважаны Клімавіцкага РАУС і старшы следчы Клімавіцкага райаддзела УСК па Магілёўскай вобласці. Устаноўлена, што ў злачынную групу ўваходзіў таксама начальнік Клімавіцкага РАУС. Старшынёй СК Беларусі ў дачыненні да гэтых асоб заведзена крымінальная справа па прыкметах злачынства, прадугледжанага ч. 3 арт. 430 КК Беларусі (атрыманне хабару ў асабліва буйным памеры). Расследаванне злачынства даручана Галоўнаму ўпраўленню па расследаванні злачынстваў у сферы арганізаванай злачыннасці і карупцыі СК.

Кар. БЕЛТА.

ЗІМА ПРЫЙШЛА. ЯЕ ЧАКАЛІ...

Здарэнні

На возеры патануў рыбак

На возеры за вёскай Вароні Столінскага раёна праваліўся пад лёд і патануў чалавек. Пра гэта на пажарны аварыйна-выратавальны пост у вёсцы паведаміў мясцовы жыхар, старшы прапаршчык аддзялення пагранічнага кантролю вёскі Гарынь Пінскага пагранатрада, які прыехаў сюды на асабістым аўтамабілі. Па радыёстанцыі інфармацыя была перададзена ў Столінскі раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях.

— Потым высветлілася, што тры жыхары населенага пункта Рэчыца Столінскага раёна лавілі рыбу на гэтым возеры. Каля 15 гадзін адзін з іх, 38-гадовы непрацуючы грамадзянін, праваліўся пад лёд. Два іншыя рыбакі — 39-ці і 38-гадовыя мужчыны — пры дапамозе падручных сродкаў спрабавалі яму дапамагчы, — распавёў падрабязнасці здарэння старшы інспектар Цэнтра даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег Малевіч. — Усё гэта ўбачыў пенсіянер, які і паведаміў пра здарэнне пагранічніку.

На жаль, дапамога ўжо не спатрэбілася: чалавек патануў на адлегласці 10 метраў ад берага. Максімальная глыбіня вадаёма складае тры метры, а таўшчыня лёду не перавышае 4-5 сантыметраў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Лёс вырашалі хвіліны

Супрацоўнікі МНС выратавалі 11-гадовага хлопчыка, які праваліўся ў палонку на Пружанскім вадасховішчы. Бяда здарылася за паўсотню метраў ад берага.

Дзіця правалілася і ледзь не пайшло пад ваду, але паспела ўхапіцца за краёчак лёду рукамі. Выратавальнікі падплылі на лодцы, падняслі хлопчыка на борт і паспрабавалі сагрэць, абгарнуўшы зімовай курткай. На беразе возера пацярпелага ўжо чакала брыгада хуткай дапамогі. Школьнік атрымаў моцнае пераахаладжэнне і быў змешчаны ў рэанімацыю цэнтральнай раённай бальніцы.

А вось у пасёлку Рэчыца Столінскага раёна парушыў тэхніку бяспекі на лёдзе дарослы чалавек. І загінуў. 37-гадовы мужчына выйшаў на лёд лавіць рыбу, праваліўся і пайшоў пад ваду. Лёд яшчэ тонкі, а людзі рызыкуюць...

Яна СВЕТАВА.

Фота БЕЛТА.

Гродзеншчына

Тэхніка, процігалалёдны матэрыял, кантроль...

Паводле інфармацыі РУП «Гроднааўтадар», на дарогах рэспубліканскага, абласнога і раённага значэння цяпер працуе ўся неабходная тэхніка — раскідвальнікі пяску і солі, снегаачышчальнікі.

Толькі на падсыпцы магістральных трас на працягу двух сутак зрасходавана больш за дзве тысячы тон процігалалёднага матэрыялу. За станам дарог сочаць не толькі спецыялісты дарожна-эксплуатацыйных упраўленняў, але і супрацоўнікі ДАІ, якія цяпер пастаянна дзяжураць разам з дыспетчарамі «Гроднааўтадара». На некаторыя арганізацыі, паводле інфармацыі начальніка Гродзенскай абласной Дзяржаўтаінспекцыі Сяргея Талатая, даводзіцца складаць адміністрацыйныя пратаколы, але, як правіла, праблемы ўдаецца вырашыць аператыўна.

Тым не менш гэта, зразумела, не панацэя ад аварый на дарогах. Каля 18 гадзін у сераду адбылося лабавое сутыкненне аўтамабіляў «Опель» і «БМВ» на мосце цераз раку Котра на аўтадарозе «Гродна — Астрына — Радунь». Паводле папярэдніх звестак, «Опель» выехаў на сустрэчную паласу руху — кіроўца загінуў на месцы, а пасажыр гэтага аўтамабіля трапіў у рэанімацыю. Жанчына, якая была за рулём «БМВ», і яе сямігадовы сын атрымалі траўмы. Ніхто з удзельнікаў гэтага сутыкнення не быў прышпілены рамянямі бяспекі...

Барыс ПРАКОПЧЫК.

І на Гомельшчыне чакаецца снег

237 адзінак спецыялізаванай тэхнікі для прыборкі снегу гатовы выйсці на вуліцы Гомеля ў любы момант.

Але ж на 15 гадзін 19 студзеня неабходнасці іх выкарыстоўваць у абласным цэнтры, дзе вышыня снежнага покрыва не дасягала і 3 см, не было. Як расказаў намеснік генеральнага дырэктара гомельскага гарадскога ўпраўлення ЖКГ Рыгор Туравец, у дастатковай колькасці нарыхтавана пясчана-саляной сумесі (больш за 25 тысяч тон). У прадпрыемстве, адказным за прыбіранне вуліц абласнога цэнтра — Гарсапе — арганізавана кругласутачнае дзяжурства рабочых, якія пры неабходнасці прыцягваюцца да працы. У баявой гатоўнасці знаходзяцца 98 снегаўборачных машын, 42 пагрузчыкі снегу, 83 самазвалы для яго вывазу і 14 пескараскідвальных машын. Як паведамілі ў Гомельскім абласным цэнтры па гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага асяроддзя, 20 студзеня і на Гомельшчыне чакаецца моцны снег з заносамі і ветрам да 20 м/с.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ТРАЦІНА БРЫТАНЦАЎ АБМЯЖОЎВАЕ СЯБЕ Ў ЕЖЫ З-ЗА ІПАТЭКІ

— На выхадных яны самі ўпраўляюцца, — падхоплівае **сацработнік Алена НАРЭЙКА**. — Чакаюць панядзелка, каб я да іх прыйшла. Дружныя яны, нічога не скажу. Адна праблема, што адзінокія засталіся. А тут разам усё ж весялей. І час хутчэй бяжыць *(паглядае на гадзіннік)*. Калі дазволіце, і я ўжо пабягу. Склаліся ж па 20 тысяч — дык трэба паспець у краму да абеду, каб заказы выканаць. Мне ж яшчэ і мясцовых старых трэба абслужыць... А дзеда я нацерла маззю *(звяртаецца да бабулек)*. Вы ведаеце *(а затым зноў да мяне)*, нешта наш Фядотавіч апошнім часам аслабеў, толькі ў пятніцу з бальніцы выпісалі. Там, сын казаў, практычна нічога не еў, а як вярнуўся сюды, да сваёй часовай сям'і — дык, дзякуй Богу, і апетыт з'явіўся.

Іван Фядотавіч Брыль, якому 2 лютага споўніцца 85, згадзіўся адказаць на мае пытанні. Але папрасіў дазволу не падымацца з ложка.

— Як сюды трапілі? — цікаўлюся.

— Язык да Кіева, дачушка, дапытае. Бабкі вясковыя на вуліцы збяруцца і рознае збіраюць. Вось ад іх і пачуў пра гэты дом. А пасля сацыяльны работнік — яна да жонкі спярша хадзіла, а тады і да мяне перайшла, — пацвердзіла. Жонка ж мая памерла. Ужо 15 гадкоў, як адзін, бы без лісця ўлетку язмін. Пакуль мог, рабіў усё скрозь ля хаты. Нават людзі дзівіліся: «У Івана ўсё сваё — і капуста, і гуркі». Гэтай вясной хвароба скруціла, дык агарод не садзіў... Не змог.

— А дзеці?

— А што дзеці?.. Малодшага сына ўжо няма ў жывых. Старэйшыя і самі пенсіянеры, здароўе ў іх таксама нікудышнае. З адным я ў бальніцы зараз ляжаў. Няма каму даглядаць за мной...

Пасля гэтых слоў старэчыя вочы ўвільгатніліся. І я, шчыра прызнацца, на нейкі момант нават разгубілася. Не так часта даводзіцца бачыць, як мужчына плача.

— Суседкі вас тут не крыўдзяць: вы ж адзін, а іх — трое? — спахапілася і спрабую перавесці размову на іншую тэму.

— Чаму ж яны будуць крыўдзіць? Грошы ж з пенсіі на камунальныя выдаткі ды прадукты тыя самыя кладу ў «зберкасу», што і яны. Разам плануем свой бюджэт. Што прыгатаваць, якія прадукты купіць — усё абмяркоўваем на сямейным савеце. Атрымліваецца менш затратна, чым калі б я адзін жыў.

— А ці смачна кормяць?

— Як заправіш, так і з'ясі, — усміхаецца Іван Фядотавіч. — Прынамсі так у нас на вёсцы кажуць. Калі хочаш, каб каша была смачнейшай, адрэж кавалак каўбасы ці сала.

«За зіму Сярожка і Тамарка так прыкіпелі адно да аднаго, што расстацца не змаглі»

Наладзіць кантакт з гаспадынямі дома сезоннага пражывання атрымалася значна хутчэй. Адна з іх аказалася яшчэ той гумарысткай, а смех, як водзіцца, збліжае.

Ледзь Яўгенія Фядотаўна Гамолка ўбачыла ў маіх руках фотаапарат, тут жа пачала павучаць сваіх сябровак.

— Надзька, Лідка, што вы галовы долу апусцілі, у дзірачку глядзіце.

— Дык вы тут за старэйшую? — удакладняю праз смех.

— Не, я — за старэйшую, — ажывае Надзея Міхайлаўна. — Мне 1 студзеня 83 споўнілася.

— Ай, Надзька, адзін год розніцы, што ты ўжо!.. — жартуе Фядотаўна.

— І як адсвяткавалі дзень народзінаў і Новы год?

— Адтупалі добра *(смяюцца)*, — працягвае ўсіх весяліць Яўгенія Фядотаўна.

Надзея Міхайлаўна Мандрык — адзіная, хто праводзіць тут ужо другі сезон.

— Спадабалася так, што і на другую зімоўку папрасілася, — кажа зграбная бабулька. — Тут весялей. Ды і тое, што родная вёска непадалёку, грэе. Як душа не на месцы, дык, бывае, збяруся раніцай і пешшу паклыпаю ў родную вёску. Пагляджу, што ўсё ў парадку, — і назад. Ногі ў мяне для маіх гадоў яшчэ дзякуй Богу, толькі вось вельмі дрэнна бачу.

— А чаму вашы мінулагоднія суседзі не вярнуліся на гэтую зіму?

— Тамарка пераехала да Сярожкі. Цяперака яны жывуць разам. Яму — 76, ёй — 63. Летась тут сустрэліся і зімавалі. Так прыкіпелі адно да аднаго, што расстацца не змаглі, — распаўняла душашчыпальную гісторыю Надзея Міхайлаўна.

«Пацук застукае — дык ужо і валасы дубам»

— Не дай Бог аднэй у хаце быць, — уздыхае Фядотаўна. — Мыш застукае, пацук застукае — дык ужо і валасы дубам. Думаецца, што гэта нехта ідзе. А як паслухаеш па тэлевізары, што на свеце робіцца, дык і яшчэ большы страх апаноўвае.

— А вы як даведаліся пра дом сезоннага пражывання?

— А гэткая ў нас харошая, шустрая бабка ёсць (сацработнік. — **Н.Д.**), якая даглядала мяне. Ну дык ад яе і пачула, што ў Вязыні зрабілі гэткі домік. Фенька, кажу, дык ты мяне ўтопай туды. Яна з першага разу і ўтопала мяне сюды. Добра тут, як дома. Лепей не трэба.

— Сумуеце па доме?

— Спачатку ныла, а цяпер не нюю. Цяпер я што і дома тут. І машыны ходзяць, і людзі ходзяць. Дагэтуль зімавала ў сына. У яго дачка выйшла замуж, хлопчыка нарадзіла. Дык там ужо мне і месца не будзе. Ды і цяжка мне ў горадзе. Там на чацвёртым паверсе нямашака ліфта: дык гляджу ўніз, як у яму. Унучка калі-нікалі мяне памаленьку на двор зводзіць. Вось і ўся сувязь з зямелькай. Я родам з вёскі Рогавічы. Ад Вязыні недалёка — мусіць, кіламетраў 9-10.

— І няўжо аб роднай хаце душа не баліць, як суседцы?

— А што там? З кута ў кут ходзіш. З аднэй лавачкі — на другую. Нікога няма і пагаварыць. Нідзе нікога, з усіх канцоў усе пустыя хаты. Адна я. Сям'і нямашака. Курэй нямашака, свіней нямашака — нічога, дзеткі, не трымаю. І ўжо і трымаць не буду. Бо ўжо не магу.

— А як вам новыя суседзі?

— А мы сябруем. У нас жарты, смешкі. Я гэтай бабкі *(Яўгенія Фядотаўна дзеліць адзін пакой з нямой Лідзіяй Васільеўнай Мароз. — **Н.Д.**)* ужо і гутарку разумею. Што рукамі пакажу, што яна мне. Вось так мы і гутарым. Дапамагаем гору адна аднэй. Надзька ж дрэнна бачыць, Лідка — не гаворыць, а мне ногі баляць. А сёння ноччу гэны Фядотавіч з ложка зваліўся, бедны. Так напужаў. Дык добра я пачула. Ліда, кажу, хутчэй уставай! Але дзе ж мы мужыку дадзім рады. Давялося ў «хуткую» тэлефанаваць.

«Што мы Фядотавіча не падзелім?»

Больш за ўсё ў сінім дамку любяць узгадаць маладосць. Калі размова заходзіць аб кавалерах, смяюцца да ўпаду. Як да веснічак праводзілі, які час быў бесклапотны. А пасля сям'я, дзеці, праца...

— Я была на паляводстве, — распавядае Фядотаўна. — Пасля прыказам паставілі на ферму. За работай свету не бачыла. Трое дзетак у школу выправіць трэба, мужу ссабойку сабраць. 12 год як памёр, нямашака.

— Я больш за цябе адрабіла на ферме даяркай, — хваліцца сваім стажам Надзея Міхайлаўна.

— Ну дык не дзіва: ты ж раней нарадзілася, — шуткуе Фядотаўна. — Вой, як даіла кароў, дык спаць хацелася. Ставіш будзільнік у вядро, каб барабаніў ля вуха. А цяперака, хоць сшывай вочы, не спіцца. Ноччу, як выб'емся разам са сну, дык пачынаем рэзаць прыпеўкі.

Вецер вее, вецер вее,
Вішанька калышацца.
Ты не вер, дзяўчына, хлопцу.
Покуль не распішацца.

— *Чаму пчолкі не гудзяць?* — падхоплівае Надзея Міхайлаўна. -

Чаму не раяцца?
Чаму хлопцы не жэняцца?
Бо дзевак баяцца.

— Ну што, падобныя мы адна да адной? — цікавіцца Фядотаўна.

— Як сёстры, — паддакваю.

— Стрыечныя... І не дзіва. У адной хатцы жывём.

— І што, зусім не сварыцеся?

— А за што? За што мы будзем сварыцца? Што мы, Фядотавіча не падзелім? *(смяюцца)*.

— Чаму не сябраваць? Калі не сябраваць, як жа ж жыць? — дадае Надзея Міхайлаўна.

❐ ❐ ❐

Вясной, у красавіку, усіх чатырох развязуць па родных хатах. А пакуль напярэдзе доўгая зіма. Якую старым дапамогуць прабавіць мясцовыя валанцёры — да слова, такія ж пенсіянеры. Час ад часу іх праведваюць і д

Інавацыі

«ЭЛЕКТРОННЫ НОС» — ПАМОЧНІК І Ў КОСМАСЕ, І Ў МЕДЫЦЫНЕ

СУМЕСНЫЯ работы па стварэнні арыгінальнай мультысэнсарнай сістэмы для распазнавання газападобных рэчываў вядуцца некалькімі калектывамі беларускіх навукоўцаў з БНТУ, БДУІР і Мінскага навукова-даследчага інстытута радыёматэрыялаў. Агульнае кіраўніцтва праекта ажыццяўляе загадчык кафедры «Мікра- і нанатэхнікі» БНТУ Юрый Плескачэўскі. Партатыўны газааналізатар, над якім шчыруюць сёння беларускія навукоўцы, будзе выкарыстоўвацца для выяўлення самага шырокага класа рэчываў: таксічных пароў, арганічных спалучэнняў, наркотыкаў, выбуховых рэчываў, ядаў і г.д.

Як патлумачыў **загадчык навукова-даследчай лабараторыі «Нанатэхналогіі» БДУІР Генадзь ГАРОХ**, абсалютна ўсе рэчывы, што існуюць у прыродзе, валодаюць нейкімі пахучымі параметрамі. Нос чалавека распазнае толькі вельмі нямногія з іх, затое «электронны нос» — а менавіта так называюць у прастамоўі новы прыбор — здольны ўлоўліваць нават звышнізкія канцэнтрацыі. Трэба патлумачыць, што аналагічныя «разумныя» прыборы ў свеце ўжо існуюць, аднак беларускія вынаходнікі прымянялі сваё ноу-хау:

— Галоўнае адрозненне нашай сістэмы ад іншых заключаецца ў тым, што мы прапанавалі прынцыпова новы падыход у стварэнні «электроннага носа». У нашай высокаадчувальнай хімічнай сістэме прадугледжаны два модулі — матрыца, якая дазваляе назапашваць і захоўваць адзінкавыя малекулы аналізуемых газаў, і матрыца высокаадчувальных сэнсараў, якія распазнаюць кампазіцыю сабранай газавай сумесі. Новыя тэхнічныя рашэнні, да якіх мы прыбеглі, дазволілі стварыць газааналізатар усяго на адным крышталі, зрабіўшы яго зусім мініяцюрным, — расказвае Генадзь Гарох. — Для вытворчасці сэнсараў мы выкарысталі арыгінальныя нанаструктураваныя матэрыялы і сучасныя мікрамеханічныя тэхналогіі, якія дазволілі нам атрымаць рэкордныя характарыстыкі. Нашы сэнсары валодаюць вельмі высокай адчувальнасцю і здольныя стварацьбольш выражаныя водгукі ў параўнанні з іншымі матэрыяламі. Трэба растлумачыць, што распазнаванне хімічных рэчываў адбываецца пасля «навучання» прыбора — гэта значыць, пасля яго знаёмства з рознымі пахамі: падчас прапампоўвання праз сістэму тых ці іншых рэчываў яна іх ідэнтыфікуе і запамінае. Такім чынам фарміруецца «бібліятэка» водгукаў, якая захоўваецца ў памяці вылічальнага ўстройства, што ўваходзіць у склад прыбора. Распазнаванне ажыццяўляецца шляхам параўнання водгуку ад газу, што аналізуецца ў пэўны момант, з водгукамі ад тых рэчываў, якія знаходзяцца ў памяці. У выпадку знаходжання ў памяці аналагічнага водгуку або камбінацыі водгукаў прыбор абавязкова прасігналізуе аб прысутнасці ў асяроддзі пароў гэтага рэчыва.



А паколькі такая сістэма можа распазнаць нават адну малекулу на мільярд, яна будзе проста незаменная ў складзе сістэм бяспекі атамных станцый, шахт, падводных лодак, касмічных апаратаў, самалётаў, аўтатранспартных сродкаў. Датчыкі прыбора будуць улоўліваць нават самыя мінімальныя дозы спецыфічных газаў і змогуць папярэдзіць загадзя аб узнікненні аварыйнай сітуацыі.

Ёсць меркаванне, што ў бліжэйшыя гады такія сістэмы, як «электронны нос», стануць ключавым напрамкам у развіцці індустрыі бяспекі. Так, «электронны нос» дапаможа распазнаваць падробленыя лекі ці парфумерыю. У машынабудаванні ён будзе выкарыстоўвацца ў сістэмах самадыягностыкі прыбораў. У харчовай, лікёра-гарэлачнай і тытунёвай вытворчасці — для кантролю за якасцю прадукцыі. У здабываючай прамысловасці — для пошуку і маніторынгу радовішчаў карысных выкапняў, а таксама для хуткай ідэнтыфікацыі мінералаў.

«Электронны нос» можа распазнаваць столькі пахаў, колькі датчыкаў знаходзіцца на яго паверхні. Універсальную сістэму, якая будзе распазнаваць максімальную колькасць рэчываў, стварыць можна, але складана. Хутчэй за ўсё, і сэнсу ў гэтым няма. Звычайна сэнсарны масіў уключае ад 8 да 30 элементаў.

— Дзякуючы выкарыстанню газаадчувальных нанаматэрыялаў мы можам на адной матрыцы памерам 1,5 х 1,5 сантыметра ўстанавіць да 32 сэнсараў, — падкрэсліў Генадзь Гарох. — Такі партатыўны прыбор і каштаваць будзе менш. Кошт стацыянарных аналагічных сістэм у свеце вагаецца ад 20 да 100 тысяч доларaў, таму нямногія могуць іх сабе дазволіць.

Самы актыўны інтарэс пакуль што праяўляюць прадстаўнікі ваеннага комплексу і расійскагага касмічнага агенцтва. Упершыню з дакладам аб сваёй рабоце навукоўцы выступілі на V беларускім касмічным кангрэсе, дзе іх распрацоўкай тут жа зацікавіліся. Як прызналі расійскія спецыялісты, партатыўны беларускі прыбор памерам з мабільны тэлефон можа аказацца незаменным як для кантролю за атмасферай касмічнага апарата, так і для касмічнай медыцыны — маніторынгу за станам здароўя і самаадчуваннем касманаўтаў.

Увогуле выкарыстанне «электроннага носа» ў медыцыне — адна з самых цікавых сфер яго прымянення. Вядома, што кожную хваробу суправаджаюць свае пахучыя спалучэнні. Малекулы надаюць дыханню чалавека спецыфічны пах. Праўда, яны ўтрымліваюцца ў паветры, што выдыхае чалавек, у мізэрнай колькасці. Ізраільскія навукоўцы стварылі «электронны нос», які па выдыху можа ўстанавіць, ці здаровы чалавек або з'яўляецца кандыдатам у пацыенты анкалагічнай клінікі. «Разумны» прыбор здольны выявіць яшчэ на ранніх стадыях наяўнасць злаякасных пухлін у галаве і пазваночніку чалавека, у яго слінных залозах ці слізістай абалонцы. Своечасовае выяўленне такой анкалогіі заўсёды было праблематычным, таму хвароба дыягнаставалася, як правіла, тады, калі рак ужо даваў ускладненні на іншыя органы. Немалаважна, што адчувальны прыбор дазваляе не проста выявіць хваробу, але і ўказвае на орган, дзе размяшчаецца ачаг анкалогіі. Іншымі словамі, «электронны нос» здольны адрозніць рак лёгкіх ад раку мозга.

Праблема заключаецца ў тым, каб зрабіць такія прыборы даступнымі не толькі для элітных клінік. Беларускія навукоўцы якраз дораць такую надзею. Аўтары праекта ўпэўнены, што іх «электронны нос» дазволіць праводзіць па даступнай цане не толькі дыягностыку, але і арганізоўваць з дапамогай тэлемедыцынскіх сістэм маніторынг стану цяжкіх хворых, якія праходзяць лячэнне ў амбулаторных умовах. «Электронная сядзелка» зможа яшчэ да абвастрэння стану хворага «ўнюхаць» любыя трывожныя сімптомы і паведаміць аб гэтым урачу.

А паколькі ў склад творчага калектыву ўваходзяць спецыялісты Мінскага навукова-даследчага інстытута радыёматэрыялаў, дзе ёсць вытворчыя магутнасці і мікрасістэмныя тэхналогіі, то пытанне серыйнай вытворчасці «электроннага носа» хваляванняў не выклікае. Аднак да завяршэння работ і стварэння рабочага ўзору айчыннай сістэмы яшчэ далёка. На жаль, але недастатковае фінансаванне праекта можа затармазіць вельмі важную справу...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЦІКАВА ВЕДАЦЬ:

Нямецкія даследчыкі сцвярджаюць, што ім удалося распрацаваць «электронны нос», які дазваляе вызначыць, ці ёсць у чалавека сардэчная недастатковасць і наколькі яна сур'ёзная. Прыбор уяўляе сабой сістэму газавых датчыкаў, якія рэагуюць на малекулы паху. Даследаваннем былі ахоплены 27 хворых з настолькі сур'ёзнымі праблемамі з сэрцам, якія вымушалі захоўваць пасцельны рэжым, 25 пацыентаў з менш сур'ёзнымі сардэчнымі праблемамі і кантрольная група, якая складалася з 28 здаровых людзей. «Электронны нос» змог дакладна адрозніць пах чалавека з хворым сэрцам ад здаровага. У 89 працэнтах выпадкаў «нос» правільна выявіў пацыентаў з хворым сэрцам і ў 84 працэнтах устанавіў здаровых людзей. Іншымі словамі, ён не знайшоў хваробы прыкладна ў кожнага дзясятага і прыкладна кожнага сёмага ўдзельніка эксперыменту памылкова папярэдзіў аб небяспецы інфаркту. Прыбор таксама змог адрозніць пацыентаў з рознай ступенню хваробы.

МАСТЫ ПАМІЖ БЕЛАРУСКАЙ І ЛІТОЎСКАЙ ЛІТАРАТУРАЙ

Асабіста пазнаёміўся з Альмай Лапінскіене параўнальна нядаўна, калі я пачаў праяўляць больш інтарэсу да літоўскіх і беларускіх літаратурных сувязяў. Хоць завочна я ведаў яе даўно. Як перакладчыцу з беларускай мовы, і асабліва як сур'ёзную даследчыцу культурнага жыцця Вільнюса. Бо стары Вільнюс — культурнае багацце і літоўцаў, і беларусаў. Засяродзіўшы ўвагу на старажытнай сталіцы Вялікага Княства Літоўскага, на яе гісторыі, старой культуры, нельга не заўважыць беларускіх творцаў, пісьменнікаў і вучоных, якія тут жылі і стваралі. Ад Францыска Скарыны, Францішка Багушэвіча, Максіма Гарэцкага да Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка. Беларуская Вільня не магла не зацікавіць такую маладую і творчую асобу, як А. Лапінскіене. Атрымаўшы ў Вільнюскім універсітэце спецыяльнасць філолага, яна пачала працаваць у Інстытуце літоўскай мовы і літаратуры, збірала матэрыял для дысертацыі аб літоўска-беларускіх літаратурных сувязях у 1940—1980 гг.

— Беларускай літаратурай пачала цікавіцца каля 1980 года, калі стала збіраць матэрыял і пісаць дысертацыю аб літоўска-беларускіх літаратурных адносінах. Абаранілася ў 1985 годзе, — гаворыць Альма Лапінскіене. — Па-беларуску чытаць навучылася самастойна, калі паглыбілася ў вывучэнне нашых літаратурных сувязяў і пісала на гэту тэму дысертацыю, але асабліва прасунулася ў пазнанні беларускай, калі пачала з яе пераклада ць. Першым пераклала па прапанове выдавецтва «Вага» раман вядомага беларускага пісьменніка Васіля Хомчанкі «Вяртанне ў агонь». Кніга ў Вільнюсе выйшла ў 1985 годзе ў папулярнай у той час серыі «Дорогами храбрых» і вялікім тыражом — 30 000. Аўтар прыдумаў інтрыгуючы сюжэт, які аб'ядноўваў сённяшні час і ваенную пару, боль страты, жыццёвыя надзеі. Цікавіла і тая акалічнасць, што аўтар перакладаў на беларускую мову і літоўскіх пісьменнікаў.

У 1988 г. у выдавецтва «Вітурыс» выйшаў новы пераклад А. Лапінскіене — анталогія беларускіх расказаў «Акно ў зялёны сад», складзеная беларускім літаратуразнаўцам Яўгенам Лецкам.

Кніга выйшла тыражом 20 000 экзэмпляраў. У ёй былі прадстаўлены 29 беларускіх пісьменнікаў: ад Якуба Коласа і Максіма Гарэцкага да Міхася Лынькова, Івана Мележа і Уладзіміра Караткевіча.

У 1988 годзе ў Мінску на беларускай мове выйшла цікавая кніга «Перазовы сяброўскіх галасоў». Неўзабаве яна была выпушчана і ў Вільнюсе, на літоўскай мове з назвай «Літоўска-беларускія літаратурныя сувязі». Яе напісалі прафесар Адам Мальдзіс і доктар Альма Лапінскіене.

— Наш інстытут, які ў той час называўся Інстытутам літоўскай мовы і літаратуры, пасябраваў з аналагічнай беларускай навуковай установай — Інстытутам літаратуры імя Янкі Купалы. Параўнальная літаратура ў той час была даволі папулярная. Але больш шырокія работы па літоўска-беларускім літаратуразнаўстве не вяліся. Кіраўніцтва абодвух інстытутаў вырашыла, што гэтую брэш можна запоўніць сумеснымі намаганнямі. Тады я і стала працаваць з прафесарам Адамам Мальдзісам, — гаворыць А. Лапінскіене. — Мы ажыўлена перапісваліся. Ён пісаў мне на беларускай, я яму — на літоўскай. У мяне захаваліся ўсе яго лісты. Прафесар пісаў канструктыўна, удумліва, і ў той жа час адчувалася яго цеплыня і дружалюбнасць, гумар. А. Мальдзіс — не толькі вельмі працавіты вучоны і эрудыт, які здзіўляе аб'ёмам і глыбінёй ведаў, але і вельмі цёплы, прыязны і добрай душы чалавек. Менавіта Адам Мальдзіс, яго чалавечая цеплыня ўцягнула мяне ў арбіту беларускай культуры і літаратуры.

Стасункі з А. Мальдзісам спрыялі і стварэнню Літоўскай асацыяцыі беларусістаў, якая функцыянавала як аддзяленне Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Гэтай асацыяцыяй з моманту яе заснавання ў 1991 годзе да пачатку 2011 г. кіравала доктар А. Лапінскіене.

У 1994 г. з'явіўся новы пераклад з беларускай мовы. А. Лапінскіене пераклала гістарычны прыгодніцкі раман «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Караткевіча.

У 1997 г. А. Лапінскіене пераклала на літоўскую мову раман пісьменніцы Валянціны Коўтун «Крыж міласэрнасці». Гэты раман у Літве заслужыў асаблівую ўвагу, таму што яго галоўная гераіня, вядомая беларуская паэтка і рэвалюцыянерка Цётка — Алаіза Пашкевіч — жыла і працавала ў Вільні, выйшла замуж за вядомага літоўца, стваральніка Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі Сцяпонаса Каірыса.

Дэвіз А. Лапінскіене — «За кожны цуд трэба плаціць самім сабой». Цуд, вобразна кажучы, гэта і новыя масты, якія яна ўзводзіць паміж нашымі літаратурамі.

Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,
карэспандэнт «Звязды», фота аўтара.
г. Вільнюс.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

ПРАДАЛІ ЗА ГОД ДВА АЎТО. ЦІ ЁСЦЬ ІЛЬГОТЫ ПА ПАДАХОДНЫМ ПАДАТКУ?

Сям'я мінчан-пенсіянераў за год прадала два легкавыя аўтамабілі. Ну як прадала? Калі гаварыць пра «Жыгулі» 35-гадовага ўзросту, дык ад яго заяўнікі простага фактычна пазбавіліся як ад непатрэбнай рэчы — абы вызваліць месца ў гаражы.

Хоць мінімальны даход, не аспрэчваюць людзі, усё ж атрымалі — адзін мільён рублёў. За другі легкавік 1993 года выпуску пенсіянеры выручылі адну тысячу доларaў. Дык у чым праблема? Мінчане ведаюць, што пры продажы больш як аднаго аўтамабіля на працягу каляндарнага года трэба звяртацца ў падатковую інспекцыю. І ім, не выключана, давядзецца заплаціць падаходны падатак на вышэйназваны прыбытак. Вось людзі і пыталіся: як гэта зрабіць правільна, ці належаць ім, як пенсіянерам па ўзросце, якія льготы ці прэферэнцыі па аплаце гэтага самага падатку?

Па каментарый «Звязда» звярнулася ў прэс-цэнтр інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па горадзе Мінску. Яго супрацоўнікі аператыўна прадаставілі рэдакцыі кампетэнтную інфармацыю, што цікавіла заяўнікаў.

— Сапраўды, калі на працягу каляндарнага года — з 1 студзеня па 31 снежня — грамадзяне прадалі больш за адзін легкавы аўтамабіль, ім давядзецца звяртацца ў падатковую інспекцыю па месцы жыхарства, падаваць падатковую дэкларацыю, — сказалі нам. — Спатрэбіцца назваць дату продажу, імя, імя па бацьку, прозвішча, адрас пражывання пакупніка кожнай машыны. На падставе гэтых і іншых звестак падатковы інспектар зробіць разлік: ці трэба плаціць падаходны падатак, калі так, дык колькі канкрэтна. Сапраўды, могуць быць сітуацыі, калі грамадзянін, нават прадаўшы на працягу каляндарнага года больш за адзін легкавік, можа быць вызвалены ад яго аплаты ці заплаціць мінімальную суму. Умоўна кажучы, калі першы аўтамабіль быў некалі набыты за 100 доларaў, а цяпер прададзены таксама за 100 доларaў, дык даход тут выходзіць нулявы. Уявім, што другі легкавік некалі дастаўся грамадзяніну за 100 доларaў, а цяпер ён пазбавіўся ад яго за 120 доларaў. Прыбытак у гэтым выпадку склаў 20 доларaў. Вось з іх фізічная асоба і павінна будзе заплаціць 12 працэнтаў падаходнага падатку. А можа, і не: усё залежыць ад канкрэтнай сітуацыі.

Цану продажу аўтамабіляў заяўнікам указваць і прадастаўляць пацвярджальныя дакументы не трэба: падатковыя органы выкарыстоўваюць спецыяльныя базы, куды такія звесткі ўносяцца пасля заключэння дагавораў куплі-продажу. Што датычыцца такога рарытэту, як 35-гадовыя «Жыгулі», дык у гэтым выпадку выкарыстоўваюцца спецыяльныя методыкі вызначэння іх кошту, дакладней, суадносін цаны куплі (некалі) і продажу.

Як распавялі далей у прэс-цэнтры інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па горадзе Мінску, на жаль, ніякіх ільгот ні пенсіянерам па ўзросце, ні нават ветэранам вайны ў гэтай частцы не прадугледжана. Саму падатковую дэкларацыю ў падатковую інспекцыю па месцы жыхарства трэба падаць у тэрмін да 1 сакавіка гэтага года.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Факт

ТАЎКАЧОМ ДЫ....

57-гадовы жыхар в. Савічы (Баранавіцкі раён) праляжаў у бальніцы паўтара месяца з чэрапна-мазгавой траўмай і памёр.

Падазрэнне лягло на 29-гадовую суседку памерлага, з якой яны разам выпівалі, а пасля пасварыліся. Мужчына выгнаў жанчыну з хаты, тая пайшла дадому, узяла драўляны таўкач для бульбы, вярнулася і ўдарыла ім некалькі разоў суседа па галаве. Мужчына па медыцынскую дапамогу не звяртаўся, а яшчэ тры дні працягваў піць гарэлку. Потым яго знайшлі ў непрытомным стане на вуліцы пад плотам. Заведзена крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ДОМ ЗГАРЭЎ, АЛЕ БЯДА АБЫШЛА САМУ ГАСПАДЫНЮ

Як толькі прыціснулі маразы, людзі сталі больш непакоіцца пра ацяпленне свайго жылля. Вось толькі калі з пячным ацяпленнем што не так — чакай бяды.

— Як мяркуецца, трэшчына ў коміне стала прычынай пажару ў жылым доме ў вёсцы Гольчыцы Слуцкага раёна. Да прыбыцця пажарных-выратавальнікаў агонь паспеў распаўсюдзіцца па ўсёй плошчы даху і столевых перакрыццяў дома. Здавалася, што шанцаў у людзей, калі яны былі ўнутры, ужо не было, — распавяла старшы інспектар цэнтра прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС Дыяна Жалязняк. — На шчасце, бяды не здарылася: 60-гадовая пенсіянерка, можна сказаць, сама сябе і выратавала. Пражываючы ў доме адна, яна загадзя паклапацілася пра ўстаноўку аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка. Пачуўшы яго рэзкі гук, жанчына выйшла з дома. Апошні настолькі пацярпеў, што жыць далей у ім ужо немагчыма. Але самае галоўнае — гаспадыня захавала жыццё. А жыць яна будзе ў сваіх дзяцей. Дарэчы, здарэнне адбылося напярэдадні Дня выратавальніка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК» СООБЩАЕТ,
что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк»
27 ЯНВАРЯ 2012 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ.

Место нахождения общества, место и время проведения собрания:
220036, г. Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Об утверждении изменений в Устав ОАО «Белагропромбанк».
2. О безвозмездной передаче в собственность Республики Беларусь имущества ОАО «Белагропромбанк».
3. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи Открытому акционерному обществу «Туровщина».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 18 января 2012 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут знакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 19 января по 25 января т.г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 25 января 2012 года по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка, филиалов (отделений) по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 54 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

Телефон для справок: 8(017) 229 64 54.

Телефон Контакт-центра Банка – 136
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.
www.belapb.by
Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

20 февраля 2012 года в 11.00 состоится очередное общее собрание акционеров
ОАО «Минскэнергострой»

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и основные итоги направления деятельности Общества в 2012 г.
2. Отчет наблюдательного совета Общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2011 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков Общества за 2011 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2011 году и 1-м квартале 2012 г.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О совершении сделок Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39, офис 208.

Начало регистрации — 10.00.

УНП 100008291

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

Заказчик-Застройщик – ОАО «Минскпромстрой».

Зарегистрировано Минским горисполкомом решение № 698 от 20 июня 2000 года в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100064639.

Лицензия № 02250/0627487 выдана Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь и действительна до 15 марта 2014 года.

Адрес: 220034, г. Минск, пер. Войсковой, 12.

Режим работы: понедельник – четверг 9^{00} – 17^{45} (обед 13^{00} – 14^{00}), пятница 9^{00} – 16^{45} (обед 13^{00} – 14^{00}), выходной – суббота, воскресенье.

Выполняя функции Заказчика, в течение последних трех лет ОАО «Минскпромстрой» построены и введены в эксплуатацию объекты:

- жилой дом № 8 по ул. Тимошенко;
- жилые дома №№ 16, 20 по ул. Бурдейного;
- жилые дома №№ 89; 91; 73; 75 по ул. Притыцкого;
- жилой дом № 36 по ул. Чечота.

Цель проекта – Строительство объекта «12-17-этажный жилой дом типовых потребительских качеств № 2 по генплану со встроенными помещениями соцкультбыта в жилом микрорайоне «Масюковщина-5» в г. Минске» общей площадью 11001,8 кв.м, в том числе общая площадь квартир – 10953,9 кв.м.

Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Начало строительства объекта – 4-й квартал 2010 года.

Окончание строительства – 2-й квартал 2012 г.

Месторасположение объекта – Фрунзенский район г. Минска м-он «Масюковщина-5», на пересечении ул. Лещинского – Матусевича напротив дискаунтера «На недельку».

Жилой дом запроектирован: 12, 17 этажей, 2 подъезда, 4 лифта, всего квартир – 178, из них: 1-комнатных – 70 шт., 2-комнатных – 70 шт., трехкомнатных – 38 шт. На первом этаже – 2 блока административных помещений, магазин непродовольственных товаров и служебное помещение Товарищества собственников с отдельным входом.

Предусмотрены 3 гостевые парковки на 54 машино-места. Парковочные места автотранспорта планируются в коммунальной зоне микрорайона. Благоустройство внутридворовой территории предусматривает пешеходные дорожки, озеленение, хозяйственную площадку.

В состав общего имущества объекта входят: лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, кровля, технические и подвальные этажи, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры (в т.ч. внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения дома), озеленения и благоустройства, помещение Товарищества собственников, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Конструкция здания – монолитный железобетонный каркас с плоскими безригельными монолитными перекрытиями. Наружные стены – блоки из ячеистого бетона со штукатуркой. Окна – ПВХ профиль; в квартирах с двухкамерным стеклопакетом, на лоджиях с однокамерным.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 28.11.2008 г. № 2867-5/08. Получены положительные заключения КАиГ от 13.04.2009 г. № 04-13/46Ф и № 01-23/178Ф от 23.01.2009 г. Государственной экологической экспертизы от 19.07.07 г. № 214.

Получено разрешение Госстройнадзора № 2-208Ж-113/10 от 26.01.2011 г. на производство строительно-монтажных работ.

Участок площадью 0,2371 га передан ОАО «Минскпромстрой» на основании решения Мингорисполкома № 1997 (п. 11) от 02.09.2010 г. для строительства объекта. Свидетельство о государственной регистрации земельного участка и возникновения права на него от 23.09.2010 г. № 500/1028-2577.

Заключение договоров создания Объекта долевого строительства проводится по неизменной на период действия договора цене. На дату опубликования декларации и по 29 февраля 2012 г., для юридических лиц и физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, к долевому строительству предлагаются 4 квартиры общей площадью 257,4м^2, расположенных на 3 и 8 этажах, из них: однокомнатная квартира общей площадью 45,8м^2; двухкомнатные квартиры общей площадью 62,5 и 64,9м^2; трехкомнатная квартира общей площадью 84,2м^2.

Стоимость 1(одного) кв.м общей площади составляет 9,2 млн руб.

Заказчиком-Застройщиком по строительству объекта выступает ОАО «Минскпромстрой». Функции генерального подрядчика исполняют филиалы ОАО «Минскпромстрой», выполняя при этом часть работ самостоятельно, а часть по субподрядным договорам со специализированными сторонними организациями.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходом работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: г. Минск, пер. Войсковой, 12, каб. 312 или по телефонам: 283 15 88; 283 15 78; Velcom (044) 787 12 68.

Сайт компании: www.minskpromstroy.by

Генеральный директор В.С.Нехай

Между Обществом с дополнительной ответственностью «БАСКЕТ ПЛЮС» и Открытым акционерным обществом «БЕЛГАЗПРОМБАНК»

совершены следующие сделки с заинтересованностью аффилированных лиц:

• заключен кредитный договор, согласно которому ОАО «Белгазпромбанк» предоставляет ОДО «БАСКЕТ ПЛЮС» кредит в форме кредитной линии для финансирования строительства нежилых помещений в строящемся объекте «Многоуровневая автостоянка в комплексе с автовокзалом «Центральный», объектами торговли, сервиса, общественного питания по ул. Бобруйской в г. Минске» (далее – Объект), согласно договору создания объекта долевого строительства, заключенному с Иностранным обществом с ограниченной ответственностью «Миатон» (далее-Договор долевого строительства);

• заключен договор залога прав ОДО «БАСКЕТ ПЛЮС» (как дольщика по Договору долевого строительства) в качестве обеспечения исполнения обязательств ОДО «БАСКЕТ ПЛЮС» по кредитному договору, заключенному с ОАО «Белгазпромбанк»;

• заключен договор ипотеки (залога имущества, которое поступит в будущем) в качестве обеспечения исполнения обязательств ОДО «БАСКЕТ ПЛЮС» по кредитному договору, заключенному с ОАО «Белгазпромбанк». Предметом залога является недвижимое имущество, которое поступит в собственность ОДО «БАСКЕТ ПЛЮС» в будущем согласно Договору долевого строительства и которое на момент заключения договора ипотеки не считается созданным в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Критерий заинтересованности — аффилированное лицо (Компания с ограниченной ответственностью «РИАТЕРОН ХОЛДИНГС ЛИМИТЕД») владеет двадцатью и более процентами долей в уставном фонде ОДО «БАСКЕТ ПЛЮС» и ИООО «МИАТОН».

У **суд Столінскага раёна Брэсцкай вобл.** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **Свірыдчук (дашлюбнае прозвішча Бас) Марыю Васільеўну,** 13.08.1971 г.н., ураджэнку в. Харомск Столінскага раёна, якая ў 2005 г. з'ехала за межы Рэспублікі Беларусь і яе месцазнаходжанне невядомае. Просім грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі аб гэтай грамадзянцы, паведаміць іх суду Столінскага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

Сёння — Дзень прафілактыкі грыпу

Мыйце рукі і «разгружайцеся»

Пачатак эпідэмічнага ўздыму захваральнасці на грып і вострыя рэспіраторныя інфекцыі ў Беларусі чакаецца, што называецца, на днях. Як прагназуе Нацыянальны цэнтр па грыпе, эпідэмія будзе сярэдняй інтэнсіўнасці, з цыркуляцыяй вірусаў грыпу А (H1N1, H3N2) і В. Па выніках маніторынгу частата выяўлення вірусных антыгенаў складае зараз 38,5 працэнта. У даследаваным біялагічным матэрыяле пераважаюць негрыпозныя рэспіраторныя вірусы — такія, як адэнавірусы, змешаныя інфекцыі, рэспіраторна-сінтыцыяльны вірус, вірусы парагрыпу.

Паводле інфармацыі Міністэрства аховы здароўя, у Беларусі шмат гадоў запар сезонная эпідэмія грыпу прыпадае на канец студзеня — пачатак лютага. Штогод на грып і вострыя рэспіраторныя інфекцыі ў нас хварэе кожны трэці жыхар краіны. Прычым менавіта на грып прыпадае каля 10 працэнтаў выпадкаў. Палова ўсіх, хто хварэе на вострыя рэспіраторныя інфекцыі, — дзеці да 14 гадоў. Найбольшая колькасць захворэлых за апошнія 15 гадоў рэгістравалася ў нас у 1995 і 1999 гадах.

Комплексная абарона насельніцтва ад грыпу прадугледжвае спецыфічную прафілактыку з выкарыстаннем вакцын, лекавых прэпаратаў, а таксама правядзенне аздараўленчых і агульнаўмацавальных мерапрыемстваў. Адзіным навукова абгрунтаваным, эфектыўным метадам папярэджвання грыпу з'яўляецца вакцынацыя. Вакцыны маюць строгую спецыфічнасць да найбольш актуальных у сезоне штамаў віруса грыпу. Вакцынапрафілактыка больш як у 2 разы перавышае эфектыўнасць неспецыфічных сродкаў прафілактыкі. Не патрабуе значных матэрыяльных затрат, паколькі прышчэпка выконваецца аднакратна або двойчы (дзецям). Вакцыны прымяняюцца больш як 50 гадоў, прычым за гэты час іх бяспека і эфектыўнасць узраслі. Усе дазволеныя вакцыны праходзяць у Беларусі кантроль якасці.

Проціпаказаннямі да імунізацыі грыпознымі вакцынамі з'яўляюцца алергічныя рэакцыі на курыны бялок, рэакцыя на папярэдняе ўвядзенне вакцыны, імунадэфіцітны стан, новаўтварэнні. Таму прышчэпка робіцца толькі пасля агляду ўрача.

Вірус грыпу пастаянна муціруе, мяняе свае вартасці, чаму эпідэміі грыпу і паўтараюцца з года ў год, а леташняя вакцына ўжо не абараняе сёлета.

У сезон 2011-2012 гадоў для краін Паўночнага паўшар'я Сусветная арганізацыя аховы здароўя вызначыла наступныя штамы вірусаў грыпу:

падобны вірусу A/California/7/2009 (H1N1);

падобны вірусу A/Perth/16/2009 (H3N2);

падобны вірусу B/Brisbane/60/2008.

Менавіта яны і ўвайшлі ў склад супрацьгрыпозных вакцын. Наогул назіранне за распаўсюджваннем віруса грыпу і яго змяненнем ажыццяўляюць спецыяльныя міжнародныя цэнтры і нацыянальныя лабараторыі Сусветнай аховы здароўя. На падставе атрыманай інфармацыі эксперты арганізацыі і фарміруюць штогадовыя рэкамендацыі па саставе грыпозных вакцын. Статыстыка апошніх дваццаці гадоў сведчыць: рэкамендаваныя для ўключэння ў састаў вакцын варыянты вірусаў грыпу супадалі больш як у 90 працэнтах выпадкаў.

Вакцыны розных вытворцаў не адрозніваюцца па варыянтах вірусаў грыпу. У карысці масавай вакцынацыі ад грыпу сумнявацца наогул не даводзіцца. У калектыве, дзе прышчэплены 70 працэнтаў людзей, парушаецца ланцуг перадачы віруса грыпу ад хворага да здаровага, а значыць, і эпідэмія немагчымая ў прынцыпе. Летась у нашай краіне падчас кампаніі масавай імунізацыі было прышчэплена каля 32 працэнтаў насельніцтва.

Напярэдадні эпідэміі ўрачы рэкамендуюць не ігнараваць агульныя меры прафілактыкі:

1. Вітаміны і мікраэлементы. Асабліва важная аскарбінавая кіслата (вітамін С), якая спрыяе павышэнню супраціўляльнасці арганізма. Вітамін С прымяняюць па 0,5-1 г 1-2 у дзень. Неабходна таксама ўжываць як мага больш фруктаў і гародніны. Пры гэтым улічваць, што вялікую колькасць вітаміну С змяшчае сок квашанай капусты, цытрусавыя — лімоны, ківі, мандарыны, апельсіны, грэйпфруты.
2. Загартоўванне. Адзін з важнейшых метадаў прафілактыкі розных прастудных захворванняў. Дазваляе нармалізаваць функцыю дыхальных шляхоў падчас ахалоджвання, што зніжае дозу віруса, які трапляе ў арганізм падчас заражэння. Таму шляхам загартоўкі можна калі і не поўнасцю пазбегнуць прастуды, то знізіць адчувальнасць да яе. Мерапрыемствы па загартоўцы павінны праводзіцца штодня і працягла, гэта павінна быць ладам жыцця.
3. Ніякіх стрэсаў, стомленасці і прастуд. Калі мы сур'ёзна перагружаем арганізм фізічнай ці разумовай працай, знаходзімся ў стане стрэсу або дэпрэсіі — значыць, наш імунітэт аслаблены.
4. Народныя сродкі. Грып — не тая хвароба, якую можна вылечыць часнаком ці парай над бульбай. Народныя сродкі можна прымяняць толькі ў якасці дадатковага лячэння.

ЗВЫЧАЙНЫЯ МЕРЫ ПАЎСЯДЗЁННАЙ ГІГІЕНЫ:

- Прыкрывайце нос і рот папяровай сурвэткай падчас кашлю і чхання. Выкарыстаную сурвэтку выкідайце ў сметніцу.
- Часцей і старанна мыйце рукі вадой з мылам, асабліва пасля кашлю і чхання.
- Не дакранайцеся да вачэй, носа ці рота. Інфекцыя перадаецца менавіта такім чынам.
- Імкніцеся пазбягаць блізкага кантакту з хворымі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Адказы на сканворд

Па гарызанталі: Варогі. Луза. Участак. Аўрал. Кардан. Ілжэц. Маг. Пампір. Акопа. Чэк. Лато. Ток. Мыла. Адат. Елтава. Лат. Мак. Пампір. Акопа. Чэк. Лато. Ток. Мыла. Адат